Сярод аленяў і дзікоў

Вам надакучыла назіраць за жывёламі па тэлевізары, лежачы на сафе? Збірайцеся на сапраўднае сафары — у Нацыянальны парк “Прыпяцкі”, не пашкадуеце...

У лексіконе беларускага турызму ўпершыню з’явіліся словы іншаземнага паходжання — “сафары” і “сафары-парк”. Узяліся яны, як кажуць, не з неба, хоць у паветры віталі даўно. Тэрмінам “сафары” беларускія фатографы пейзажнага жанру сваволяць ужо не першы год і маюць сваю рацыю, бо здзяйсняюць, па сутнасці, самыя сапраўдныя фотападарожжы.

У арабскай мове слова “сафары” якраз і азначае падарожжа. Але не толькі. Ёсць некалькі іншых значэнняў, так, напрыклад, называюць запаведнік з дазволам палявання на дзікіх жывёл. Цяпер моўная экзотыка з Афрыкі займае і ў нас сваё легальнае становішча — дзякуючы Нацыянальнаму парку “Прыпяцкі”, дзе на базе колішняй паляўнічай гаспадаркі “Смолавіца” створаны парк для падарожжаў і назірання за дзікімі жывёламі.

Не спазніцеся на цягнік!

Ідэя знайшла ў нацпарку цікавае ўвасабленне, і першыя тысячы турыстаў — айчынных і замежных — ужо змаглі “пасафарыць” і атрымаць незабыўныя ўражанні ад сустрэч з зубрамі, аленямі і дзікамі. Цяпер па вальеры курсіруюць цягнічкі з турыстамі.

Дзікая жывёла пачала прызвычайвацца да частых турыстычных ваяжоў, паводзіць сябе смела і трымаецца побач з цягніковымі маршрутамі. Таму здымаць звяроў даволі проста нават “мыльніцай”. Няцяжка ўявіць, колькі радасных эмоцый перажываюць дарослыя і маленькія пасажыры падчас двухгадзіннай вандроўкі.

Але сафары па-беларуску спакусіла мяне здымаць жывёл не толькі з утульнага назіральнага крэсла. Бо адна справа — сачыць за статкам тых жа аленяў з акенца цягнічка, слухаючы расповеды красамоўнага экскурсавода. І зусім іншая — апынуцца сам-насам з дзікай прыродай, стаць “сваім” для звяроў і птушак, заставацца для іх незаўважаным, гадзінамі чакаць “кадр” і лавіць яго.

Усе на абед!

У аленяў у гэтую восеньскую пару яшчэ доўжыўся час “вяселляў”. Самцы-рагулі збіралі сапраўдныя “гарэмы”, абуджалі наваколле ровамі, учынялі бойкі з сапернікамі. Карацей кажучы, гон у аленяў — час асаблівы, вельмі спрыяльны для фотасафары.

Дзмітрый Макіявец, якому ў гэтай вандроўцы давялося дзяліць са мною і ўражанні, і хвіліны чакання, і кубачак кавы на ўзбочыне дарогі, адказвае якраз за жывёльны свет у гэтым вальеры, дарэчы, самым вялікім у Еўропе. Яго плошча складае 4716 гектараў. Чацвёрты год вядучы ветэрынарны ўрач нацпарку сочыць за выглядам дзікоў, аленяў і зуброў, іх перамяшчэннем па тэрыторыі, звычкамі. Вядзе ўлік жывёл, адказвае за рэжым і парадак знаходжання ў вальеры паляўнічых і турыстаў, егераў і леснікоў, сочыць за выкананнем санітарных нормаў.

Спыніўшыся на адной з лясных дарог, заўважаю, што з’яўленне “доктара” ў полі зроку жывёл не надта іх турбуе. Магчыма, яны ўжо прывыклі бачыць яго штодня ля падкормачных пляцовак і назіральных вышак, чуць гук ветэрынарскага уаза. Дзікі смела перабягалі і няспешна пераходзілі дарогу літаральна ў некалькіх кроках перад Дзмітрыем, ці за ягонай спінаю. Быццам ведалі, што ў гэты час і ў гэтым месцы ён заўсёды ладзіць свае тэлефонныя сеансы і ніякай пагрозы для жывёл не ўяўляе. “Вось дык шанцуе! — міжволі пазайдросціў я Дзмітрыю. — У яго ёсць магчымасць штодня бываць у незвычайным атачэнні”.

Сакрэт аказаўся вельмі просты. У гэты час ішла раздача кармоў на адной з бліжэйшых пляцовак, і прывучаныя дзікі дружна падцягваліся да “абедзеннага стала”. Паколькі іх тут ніхто не турбуе, яны і не звяртаюць асаблівай увагі на чалавека з тэлефонам у руках. Мае чаканні не падмануліся. За адзін дзень, які быў дазволены для сафары, адбылося шмат цікавых сустрэч з жывёламі.

— Колькі працую, ніяк не магу перастаць здзіўляцца гэтаму бясконца цікаваму і нечаканаму свету жывёл, — заўважае

ветэрынар. — Зімою ўдаецца карміць аленяў ледзь не з далоняў. У вяснова-асенні перыяд, калі корму хапае і пад нагамі, жывёлы крыху “дзічэюць” і разбрыдаюцца па больш ціхіх куточках. Але тым, хто прыязджае сюды на сафары, заўсёды шчасціць убачыць даволі вялікую іх колькасць. Не памятаю такога, каб турысты засталіся незадаволеныя ўбачаным.

Па волі лёсу

Зразумела, каб жывёлы ўвесь час траплялі на вочы турыстаў, іх павінна быць шмат, неабходна стварыць адпаведныя ўмовы. Гэтым і заклапочана адміністрацыя нацпарку, вальерныя егеры і леснікі, ветэрынарны ўрач Дзмітрый Макіявец.

— Наогул, я марыў стаць аграномам і хацеў паступіць у Гродзенскую аграрную акадэмію, — прыгадвае спецыяліст сваю дарогу ў прафесію. — Але не хапіла балаў, і мне прапанавалі вучыцца па спецыяльнасці “ветэрынарная медыцына”. Спачатку не вельмі падабалася, а потым як палюбіў! Цяпер рады, што менавіта гэтак усё і атрымалася ў маім жыцці. Хіба працаваў бы я ў гэтым незвычайным месцы, ці патрапіў бы з вёскі Фядоры Столінскага раёна ў вёску Ляскавічы — цэнтр нацыянальнага парку!?

Ён прыехаў на Петрыкаўскае Палессе пасля армейскай службы. У арміі, дарэчы, быў кінолагам. У нацпарку якраз ствараўся сафары-парк, быў патрэбен ветэрынар. Для Дзмітрыя, сельскагаспадарчага спецыяліста, праца з дзікімі жывёламі была новай справай. Але якой цікавай! Цікавасць падштурхоўвала назіраць і даведвацца больш і больш. І вось цяпер, як ніхто іншы, ён ведае літаральна ўсё пра сваіх “выхаванцаў”.

— У адпаведнасці з летнім улікам жывёл, на тэрыторыі нацпарку налічваецца каля 500 галоў высакароднага аленя. Дзеля развіцця гэтак званай ляскавіцкай папуляцыі жывёл спецыяльна завозілі з Польшчы і Венгрыі. Дагэтуль знаходзілася белавежская папуляцыя. Алені ў нас прыгожыя, статныя, з моцнымі рагамі — знаёміць Дзмітрый са статыстыкай даверанай яму тэрыторыі, прыгадвае і іншых насельнікаў: водзіцца тут і еўрапейская лань, таксама завезеная з Венгрыі. Статак зуброў налічвае пакуль што 11 галоў. Замежныя турысты любяць назіраць за старажытнымі дзікімі быкамі.

Сытыя і дагледжаныя

Для назірання за жывёламі ў вальеры ўсталявана 40 вышак. Колькі б жадаючых ні прыехала, месца хопіць усім. Ёсць вышкі на аднаго-двух назіральнікаў, ёсць і з разлікам на цэлыя групы. Пад вялікімі вышкамі можна замаскіраваць нават мікрааўтобус.

З 4715 гектараў усёй плошчы 695 займаюць кармавыя палеткі. Астатняя тэрыторыя — лес і балоты. Тут ці не ўся палітра біятопаў, неабходных для розных відаў жывёл. Таму сустракаюцца і лось, і казуля. А што казаць ужо пра дзікоў.

— У нацпарку налічваецца каля 2600 дзікоў, — удакладняе Дзмітрый і папярэджвае звычайнае ў такіх размовах пытанне: — У мэтах прафілактыкі робім лекавыя дабаўкі ў кармы, а ў дзіковыя купальні льём хімічны антысептык. Дзікі ў нас — паляўнічы від. Стараемся, каб яны былі сытымі. Калі жывёла сытая, яна і здаровая, лягчэй пераносіць зімовыя маразы і спраўляецца са шкоднымі вірусамі.

Для сілкавання вальерных жывёл у парку наладжана штодзённае кармленне. На 50 падкормачных пляцовак штодзень высыпаецца 5 тон зерня кукурузы і збожжа. Акрамя гэтага летам рыхтуецца каля 150 тон сена. У момант кармлення можна ўбачыць, як з усіх бакоў збягаюцца на пляцоўкі дзікі. Асабліва цікава паназіраць за праявай жывёльнай іерархіі за “абедзенным сталом”. Гаспадарыць за ім самы вялікі сякач, ён дазваляе астатнім едакам толькі на імгненне ўскочыць на бетонную пляцоўку альбо прыладкавацца дзесьці збоку. Таму самым маленькім — сегалеткам — адведзена месца сілкавання ў спецыяльнай загародцы, куды вялікім дзікам ніяк не патрапіць.

На добрых пятнаццаць кіламетраў выцягнуліся высыпаныя дарогі для сафары. Хуткасць цягніка — не болей чым 20 кіламетраў за гадзіну. Але ж за ўражаннямі не ўгнацца, бо ўжо з першай хвіліны, ледзь адчыняюцца перад вандроўнікамі вароты — пачынаюцца незапланаваныя сустрэчы з клыкастымі і рагатымі насельнікамі вальера.

Анатоль КЛЯШЧУК Петрыкаўскі раён

Источник: Родная прырода.-2011.-№11.-С.7-10.